УДК 929.5:7.046.1(476+368)

# МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫЗНАЧЭННЯ КРЫТЭРЫЯЎ ДЛЯ КАМПАРАТЫЎНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ ГЕНЕАЛОГІІ

***Ю. С. Барадзін,***
*аспірант установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Кампаратыўная генеалогія – міфалагічнае параўнанне генеалогіі, запазычанай з розных культур. У артыкуле ўвага надаецца распрацоўцы метадалагічнага падыходу, які спрыяе параўнальнаму даследаванню генеалагічных міфаў беларускай і скандынаўскай культур у спробе знайсці паміж імі ўзаемасувязі. Для паспяховага навуковага падыходу ў якасці ўзаемадзеяння вызначаюцца міфалогія і генеалогія. У якасці міфалагічнага аб’екта даследавання выступае беларускае і скандынаўскае язычніцтва. Прадметам даследавання выступае кампаратыўная генеалогія ў межах культуралогіі.

**Ключавыя словы:** генеалогія, міфалогія, пантэон, язычніцтва, беларусы, вікінгі, культуралогія, мнагабожжа.

# METHODOLOGICAL APPROACHES TO DEFINING CRITERIA FOR COMPARATIVE GENEALOGY RESEARCH

***Y. Baradzin,***
*Postgraduate Student of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** Comparative genealogy is a mythological comparison of genealogy borrowed from different cultures. The article focuses on the development of a methodological approach that contributes to the comparative study of the genealogical myths of the Belarusian and Scandinavian cultures in an attempt to find relationships between them. For a successful scientific approach, mythology and genealogy are defined as interactions. The mythological object of study is Belarusian and Scandinavian paganism. The subject of the study is comparative genealogy within the framework of cultural studies.

**Keywords:** genealogy, mythology, pantheon, paganism, Belarusians, Vikings, cultural studies, polytheism.

У метадалагічных падыходах кампаратыўнага даследавання генеалогіі выступаюць сам міф (адначасова як сага пра беларускі і скандынаўскі пантэон язычніцкага мнагабожжа і як форма свядомасці, на якой таксама сфарміраваныя нацыянальны характар і культурныя асаблівасці народаў) і кампаратывістыка, на базе якой ствараюцца міжкультурныя камунікацыі. Кампаратыўнае даследаванне генеалогіі дапамагае знаходзіць як падабенствы язычніцкага пантэона беларусаў і скандынаваў, так і адрозненні паміж імі. Праз метадалагічны падыход кампаратыўная генеалогія разглядаецца як параўнанне пакаленняў адной сям'і з прадстаўнікамі радаводу іншай сям'і, што дазваляе параўнаць генеалагічныя дрэвы беларускіх і скандынаўскіх багоў. Падобна беларускі міфолаг Георгій Ласкавы ў творы «Викинги. Походы. Открытия. Культура» параўноўвае радаводныя дрэвы скандынаўскіх конунгаў (вікінгаўскіх правадыроў) [3, с. 308] і ўсходнеславянскіх князёў, сярод якіх вылучаецца дынастыя Рагвалодавічаў (нашчадкі полацкага князя Рагвалода, а таксама яго дачкі Рагнеды) [3, с. 312].

Калі ў германа-скандынаўскім язычніцтве вікінгаў вучонымі ўжо даўно пабудавана генеалагічнае дрэва скандынаўскага пантэона [7], то ў беларускай міфалогіі яшчэ не было пабудавана дрэва багоў. Пры параўнальнай пабудове беларускага дрэва язычніцкага пантэона нароўні са скандынаўскім даследуюцца параўнальныя рысы са спробай рэканструяваць генеалагічныя міфы беларусаў і скандынаваў.

Генеалагічны метад дапамагае скласці і стварыць параўнальныя генеалагічныя дрэвы беларускіх і скандынаўскіх багоў. Кампаратывістыка дазваляе іх суаднесці. Радавод багоў, у якіх верылі старажытныя продкі беларусаў і вікінгі, адлюстроўваецца ў выглядзе схемы, якую ва ўмовах развіцця і з'яўлення новых тэхналогій можна пабудаваць з дапамогай камп'ютарнай праграмы GRAMPS. Сімвалы ў пабудаванай схеме – боствы розных пакаленняў, пасля якіх працягваецца радавод са з'яўленнем наступнага і новага пакалення мнагабожжа. Аналіз радаводу багоў адлюстроўвае ў кожнай міфалогіі, што разам са з'яўленнем космасу (Сусвету) у хаосе (змроку, цемры, пустэчы) у шэрагу пакаленняў былі першапродкі багоў (першабогі), ад якіх пачалася сям'я і працягваецца спадчыннасць.

Нямецкі філосаф Фрыдрых Ніцшэ разглядае генеалогію як навуку, што даследуе паходжанне асобы, затым радавод у выглядзе генеалагічнага дрэва і даследаванне кроўна-сваяцкіх сувязяў. Фран-

цузскі філосаф Мішэль Фуко, называючы генеалогію даследаваннем старога і стварэннем новага, стварае «генеалагічны метад», затым «генеалогію ўлады» [8]. Пантэон багоў – частка генеалогіі ўлады, паколькі багі ў язычніцкіх міфах кіруюць светам, які стварылі. Шмат увагі надае Фуко эвалюцыі ўлады. Як у самой гісторыі сярод смяротных людзей уладу над дзяржавай атрымлівалі ў спадчыну наступныя пакаленні ўладароў, так і ў язычніцтве багі атрымліваюць уладу ў спадчыну ад сваіх бацькоў і дзядоў. Напрыклад, у беларускай міфалогіі бог-грамабой Пярун стаў вярхоўным богам беларусаў, атрымаўшы ўладу ў спадчыну ад свайго дзеда – першапродка Рода – і яго сына – свайго бацькі Бялуна (Белбога) [4, с. 199]. Альбо ў германа-скандынаўскай міфалогіі Одзін, будучы спадчыннікам свайго дзеда – першачалавека Буры – і бацькі – першага аса – Бора, стаў Усебацькам усіх скандынаўскіх багоў і вярхоўным богам усіх скандынаваў [5, с. 18]. Згодна з філасофскай канцэпцыяй Фуко, улада мяняецца і эвалюцыянуе таксама ў язычніцкім пантэоне мнагабожжа.

Інтэграваная дысцыпліна «Кампаратыўная культуралогія» дазваляе даследаваць кампаратыўную генеалогію ў межах культуралогіі, каб выкарыстоўваць параўнальныя міфалагічныя аналізы. З дапамогай кампаратыўнага даследавання ў генеалогіі ствараюцца культуралагічныя параўнанні беларускага і скандынаўскага пантэонаў дзеля разумення як падабенства, так і разнастайнасці культур розных народаў. Кампаратыўная генеалогія ў міфалогіі дае магчымасць развіваць параўнальны міфалагічны аналіз. На падставе навуковага твора беларускага культуролага Аляксандра Павільча «Сравнительная культурология» ў самой генеалогіі выяўляюцца супадзенні і суадносіны падобных рыс у беларускіх і скандынаўскіх міфах [6, с. 15]. Адна са здольнасцей параўнальнай генеалогіі – спроба зразумець культуру суседніх народаў, развіваючы беларускую культуру ва ўзаемадзеянні са скандынаўскімі.

Для даследавання сям'і ў беларускім і скандынаўскім пантэоне дзейнічае сямейны метад. Выкарыстоўваючы яго, праграма-прылада GRAMPS дзеліць сваякоў на бацьку, маці, сына, дачку, унукаў, дзядулю, бабулю і ранніх продкаў, што былі дагэтуль.

Напрыклад, у міфалогіі вікінгаў першапродкі багоў – Буры і яго сын – першы з асаў – Бор, ад якога нарадзіліся будучыя стваральнікі скандынаўскага космасу – Ве, Вілі і Одзін (вярхоўны бог – Усебацька скандынаваў, бог вайны і перамог). Пасля шлюбу Одзіна і бога ветру – аднаго з ванаў – Ньёрда з багінямі нараджаюцца іншыя скандынаўскія багі, якія таксама працягваюць ствараць новыя сем'і.

Наступныя пакаленні паўночных багоў працягваюць грамабой Тор (уладальнік молата М'ёльніра) і яго сыны Магні (бог фізічнай сілы) і Модзі (бог ваяўнічай лютасці), Цюр (заступнік ваяроў), Локі (бог агню і падману), Бальдр (бог вясны) і яго сын – бог-суддзя Фарсэці, багі помсты Валі і Відар, блізнюкі Фрэйр (бог сонца і лета) і Фрэя (багіня кахання) [5, с. 26]. Падобныя генеалагічныя карціны назіраюцца і ў беларускай міфалогіі, калі разам са стварэннем беларускага космасу першабог Род і яго сыны Белбог (бог дабра) і Чарнабог (бог зла), а затым іх дзеці ствараюць новую сям'ю багоў [4, с. 197]. З новага пакалення беларускіх багоў радавод ад першапродка Рода працягваюць Пярун (вярхоўны бог маланак і грому), Сварог (бог агню і каваль), Дажбог (бог сонца), Лада (багіня кахання), Лёля і Ярыла (боствы вясны), Вялес (заступнік жывёл) [4, с. 196].

Генеалагічныя міфы беларусаў і скандынаваў маюць як падабенствы, так і адрозненні. Напрыклад, багі вікінгаў – такія ж смяротныя, як людзі. Ім уласціва паміраць. Таму, падобна людзям, яны старанна клапоцяцца пра працяг і захаванне свайго радаводу. У будучыні, калі адбудзецца скандынаўскі апакаліпсіс Рагнарок (гібель багоў) і многія з іх загінуць, тыя багі, што ацалеюць, захаваюць і працягнуць генеалагічную спадчыну, атрымаўшы ў спадчыну ўладу ад загінуўшых багоў, як у эпоху дынастычных шлюбаў сынам пераходзілі трон і ўлада пасля смерці бацькі – караля. Так бог вясны Бальдр, яго брат сляпы Хёд і іх браты-помснікі Валі і Відар атрымаюць у спадчыну ад Одзіна ўладу над усім светам, а Модзі і Магні пасля гібелі Тора будуць выконваць функцыі грамабоя, завалодаўшы молатам бацькі – М'ёльнірам [5, с. 32]. У беларускай міфалогіі цалкам адсутнічае канцэпцыя канца свету і гібелі багоў. Беларускія багі, у адрозненне ад скандынаўскіх, несмяротныя, але таксама дбаюць пра сваю спадчыну.

Шлюбы беларускіх і скандынаўскіх багоў маюць як разнастайныя падабенствы, так і адрозненні. Калі беларускія багі ствараюць новую сям'ю толькі праз шлюбы з багінямі, то ў скандынаўскіх багоў наступныя багі нараджаюцца ў выніку шлюбу і з багінямі, і з волаткамі. Нягледзячы на пастаяннае суперніцтва з волатамі пасля забойства Одзінам, Ве і Вілі першаволата Іміра, з якога стварылі сусвет, скандынаўскія багі жэняцца таксама з волаткамі: Одзін, Ве і Вілі нарадзіліся ад шлюбу аса Бора з волаткай Бестлай, праз шлюб Одзіна і волаткі Грыд нарадзіўся бог помсты Відар, ад грамабоя Тора і волаткі Ярнсаксы паходзіць бог фізічнай сілы Магні. Самы непадобны радавод сярод скандынаўскіх багоў працягвае пасля сябе Локі. Ператварыўшыся ў кабылу, пасля яго шлюбу з канём Свадзільфары нара-

джаецца васьміногі конь Одзіна Слейпнір. Сам бог агню і падману паходзіць ад волата і волаткі Фарбаўці і Лаўвеі, і разам з волаткай Ангрбодай спараджаюць найвялікшае зло: валадарку скандынаўскага пекла Хель, ваўка Фенрыра і змея Ярмунганда [5, с. 27].

Параўнанне генеалагічных дрэў беларускіх і скандынаўскіх багоў паспрыяе ў будучыні стварэнню крос-культурных камунікацый, міжкультурнаму паразуменню паміж беларускім і скандынаўскімі народамі [2, с. 315]. Даследаванне генеалогіі ў язычніцтве беларусаў і скандынаваў дазваляе вылучыць падобныя функцыі кіравання светам, якія выконваюць беларускі і скандынаўскі пантэоны (Бялун, Одзін – боствы неба, Пярун, Тор – грамабоі, Дажбог, Фрэйр – багі сонца, Зюзя, Улль, Скадзі, сляпы Хёд – боствы зімы, Лёля, Ярыла, Бальдр – боствы вясны, Сварог, Локі – багі агню, Лада, Фрэя – багіні кахання, Пярун, Одзін, Цюр – заступнікі ваяроў). Праз культуралагічны падыход расійскага культуролага Алены Борзавай, з пункту гледжання таго, што ў яе навуковым творы «Сравнительная культурология» пры параўнанні беларускай і скандынаўскай культур па рэлігійнай і міфалагічнай прыкмеце даследуецца падобнае, агульнае і асаблівае, можна рабіць высновы аб кампаратыўным даследаванні генеалогіі [1, с. 7]. Нягледзячы на бессмяротнасць беларускіх багоў і смяротнасць скандынаўскіх, яны аднолькава ствараюць і працягваюць свой радавод праз наступныя пакаленні, што дае магчымасць параўнаць генеалагічныя дрэвы беларускіх і скандынаўскіх багоў.


1. *Борзова, Е. П.* Сравнительная культурология : в 2 т. / Е. П. Борзова. – СПб. : СПбКО, 2013. – Т. 1. – 239 с.

2. *Борзова, Е. П.* Сравнительная культурология : в 2 т. / Е. П. Борзова. – СПб. : СПбКО, 2013. – Т. 2. – 344 с.

3. *Ласкавый, Г. В.* Викинги / Г. В. Ласкавый. – Минск : МФЦП, 2004. – 320 с.

4. *Ненадавец, А. М.* Міфалогія маіх продкаў / А. М. Ненадавец. – Чарнігаў : Всесвіт, 2009. – 400 с.

5. Наследники Одина. Предания скандинавских народов средневековой Европы. – СПб. : Азбука-Аттикус, 2016. – 288 с.

6. *Павильч, А. А.* Сравнительная культурология / А. А. Павильч. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2004. – 60 с.

7. Семейное древо скандинавских богов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://fiord.org/articles/mifologiya/semeynoe-drevo-skandinavskikh-bogov.html. – Дата доступа: 12.04.2024.

8. *Фуко, М.* Ницше. Генеология. История [Электронный ресурс] / М. Фуко. – Режим доступа: https://nietzsche.ru/look/xxb/fuko. – Дата доступа: 10.04.2024.